**Дзяржаўная ўстанова**

**«ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА»**




***1. Агульныя звесткі***

Літаратурны музей Максіма Багдановіча – гэта адзін з самых прыгожых музеяў беларускай сталіцы. Ён размясціўся ў двухпавярховым будынку (помнік гарадской архітэктуры XIX стагоддзя) ў Траецкім прадмесці. Траецкае прадмесце – старажытны куток Мінска на левым беразе р. Свіслач. Галоўнай вуліцай прадмесця была Траецкая, у XIX стагоддзі перайменаваная ў Аляксандраўскую (зараз вул. М. Багдановіча). Менавіта на гэтай вуліцы знаходзіўся дом, у якім нарадзіўся класік беларускай літаратуры – Максім Адамавіч Багдановіч. На вялікі жаль, гэты дом не захаваўся. Літаратурны музей Максіма Багдановіча знаходзіцца непадалёк ад таго месца.

***2. Гістарычная даведка***

Пастанова аб стварэнні Літаратурнага музея Максіма Багдановіча была прынята 19 верасня 1980 г., і з 1 красавіка 1981 г. музей пачаў дзейнічаць як установа культуры.

8 снежня 1991 г. для наведвальнікаў была адчынена экспазіцыя, прымеркаваная 100-гадоваму юбілею з дня нараджэння М. Багдановіча. У доме, пазбаўленым мемарыяльнасці, з дапамогай экспанатаў і мастацкіх прыёмаў узноўлены непаўторны паэтычны свет паэта і яго жыццёвы шлях.

***3. Апісанне калекцый***

На пачатак 2011 года ў фондах Літаратурнага музея М. Багдановіча знаходзілася каля 17 тысяч адзінак захавання музейных прадметаў асноўнага і навукова-дапаможнага фондаў.

Самая вялікая калекцыя – гэта кнігі, сярод якіх шэсць экзэмпляраў адзінага прыжыццёвага зборніка вершаў М. Багдановіча «Вянок» (тры з іх з аўтографамі М. Багдановіча), кнігі кола чытання паэта, літаратура пра яго жыццё і творчасць, кнігі беларускіх паэтаў і празаікаў канца ХІХ – пачатку ХХ стагоддзя, творы паслядоўнікаў Максіма, пераклады, прысвячэнні.

Значную калекцыю ўтвараюць рукапісы. Тут прадстаўлены: рукапісны зборнік вершаў М. Багдановіча «Зеленя» (назвы вершаў, цыклаў і кніг даюцца на мове арыгінала), некалькі старонак запісаў 1915 г., аўтографы вершаў «Я вспоминаю дом старинный…» і «Я нядужны, бязскрыдлы паэт…», а таксама ўспаміны пра паэта (А. Я. Багдановіча, З. Верас, Д. Дзябольскага і інш.), рукапісы родных і знаёмых, людзей з асяроддзя паэта (У. Караленкі, К. Пешкавай, З. Верас, А. Смоліча); аўтографы беларускіх дзеячаў культуры і мастацтва – З. Бядулі, А. Паўловіча, К. Крапівы, М. Танка, М. Лужаніна, А. Багатырова, М. Аладава, Ю. Семенякі і іншых.

Калекцыя дакументаў прадстаўлена асабістымі матэрыяламі сям’і Багдановічаў і сваякоў, а таксама дакументамі грамадска-культурнага жыцця Беларусі, якія тычацца пытанняў ушанавання памяці паэта.

У раздзеле аўдыёвізуальных помнікаў сабраны каля 6 тысяч фотаздымкаў і негатываў, сярод якіх усе вядомыя фотаздымкі Максіма, яго родных, знаёмых і сяброў, даследчыкаў яго творчасці; фотаздымкі мясцін, звязаных з жыццём і іменем паэта. На фотаздымках і негатывах – мерапрыемствы па ўшанаванні памяці паэта. Захоўваюцца ў фондах тры кінастужкі пра Максіма Багдановіча, відэафільм, грампласцінкі, дыскі і запісы вершаў, песень і музычных кампазіцый на словы М. Багдановіча, магнітафонныя запісы ўрачыстых мерапрыемстваў і ўспамінаў пра паэта.

Вобраз Максіма і тэмы яго творчасці натхнілі мастакоў на стварэнне шматлікіх твораў мастацтва. У фондах музея захоўваюцца 72 карціны, 19 скульптур, 309 графічных твораў.

### *4. Апісанне экспазіцыі*

Музей сінтэзаваў жыццёвы шлях Максіма Багдановіча і яго духоўны свет – непаўторны і арыгінальны. Мастацкае афармленне музея стылізавана пад «мадэрн» – накірунак у мастацтве канца ХІХ – пачатку ХХ стагоддзя. Элементы мадэрна прысутнічаюць у афармленні столі, у афармленні рамак у экспазіцыйных нішах, у складаным пластычным малюнку вырабаў з саломкі, у рытмічным чаргаванні модулей мэблевай канструкцыі, у вітражах.

Аўтар мастацкай канцэпцыі – Эдуард Канстанцінавіч Агуновіч, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь. За афармленне экспазіцыі Літаратурнага музея М. Багдановіча Э. К. Агуновічу прысуджана Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь (1993 г.).

Сярод самых каштоўных экспанатаў музея – чатыры зборнікі «Вянок», арыгінальныя фотаздымкі, рукапісны зборнік вершаў «Зеленя», некалькі аўтографаў.

Кожная з пяці залаў экспазіцыі адлюстроўвае пэўны перыяд жыцця паэта, цесна звязаны з асобнай тэмай яго творчасці і пераклікаецца з цыкламі вершаў зборніка «Вянок». Уся экспазіцыя пабудавана на глыбокім сімвалізме. Кожная зала мае свой экспанат-сімвал: рушнік, які вышывала маці паэта, слуцкі пояс, арыгінальны зборнік вершаў «Вянок», геліягравюра «Сікстынская Мадонна», фрагмент знакамітай карціны Рафаэля. Значнае месца ў экспазіцыі музея займаюць мемарыяльныя прадметы, фотаздымкі, кнігі сям’і Багдановічаў. Экспазіцыя таксама дапоўнена іншымі цыкламі вершаў, апавяданнямі, літаратурна-крытычнымі і публіцыстычнымі творамі.



*Экспазіцыя першай залы музея*

Першая экспазіцыйная зала знаёміць з тэмай дзяцінства і юнацтва М. Багдановіча. Прадстаўленыя матэрыялы расказваюць пра бацькоў будучага паэта, пра яго продкаў. Раскрываюцца вытокі таленту паэта і шматграннасць яго асобы. Мастацкае афармленне залы – тэма традыцыйнага беларускага рушніка на столі, вырабы з саломкі з выявамі вобразаў міфалогіі – з'яўляецца своеасаблівым раскрыццём цыклаў вершаў М. Багдановіча «У зачарованым царстве» і «Згукі бацькаўшчыны».



*Экспазіцыя другой залы музея*

Матэрыялы другой залы адлюстроўваюць працэс станаўлення творчай індывідуальнасці Максіма Багдановіча: яго літаратурны дэбют у 1907 г. у беларускай газеце «Наша Ніва» з апавяданнем «Музы□ка»; творчасць паэта ў двухмесячны ракуцёўшчынскі перыяд (цыклы вершаў «Старая Беларусь», «Места» і паэмы – «Вераніка», «У вёсцы»). Кампазіцыйным ядром гэтай залы з'яўляецца своеасаблівы «іканастас» – дванаццаць

графічных партрэтаў дзеячаў беларускай культуры. Другі рад – фатаграфічныя выявы беларускіх пісьменнікаў канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Экспанаты-сімвалы – слуцкі пояс і Статут Вялікага княства Літоўскага (1588 г.).



*Экспазіцыя трэцяй залы музея*

Трэцяя зала экспазіцыі прысвечана тэме росквіту творчага таленту М. Багдановіча. Дамінанты залы – паэтычны зборнік вершаў «Вянок» і экспанаты, з дапамогай якіх раскрываецца творчае крэда «песняра чыстае красы». Максім Багдановіч паўстае як таленавіты паэт, празаік, крытык, публіцыст, журналіст. Яго зборнік «Вянок» выйшаў з друку ў 1913 г. (па сведчанні В. Ластоўскага – у 1914 г.) у Вільні (друкарня Марціна Кухты). Паэзія М. Багдановіча – нетрадыцыйная, але блізкая кожнаму. Творы «Апокрыф» і «Апавяданне аб іконніку і залатару...» з’яўляюцца ўзорамі высокамастацкай прозы, у якіх паэт абвясціў ідэю каштоўнасці прыгажосці і мастацтва ў жыцці чалавека.



*Экспазіцыя чацвёртай залы музея*

Наступная зала – «Мадонны» – адрозніваецца ад іншых залаў экспазіцыі сваім афармленнем і ўвядзеннем асаблівых прыёмаў падачы экспанатаў. Люстра-сімвал, якая нагадвае крыж, умоўна падзяляе залу на тры часткі, але ў той самы час, аб'ядноўвае дамінанты залы: гравюру «Сіксцінская Мадонна», рукапісны зборнік «Зеленя», прысвечаны Ганне Гапановіч (стрыечнай сястры), партрэт Ганны Рафаілаўны Какуевай, яраслаўскай знаёмай паэта. Мадонна – адзін з цэнтральных вобразаў у творчасці М. Багдановіча. Ён раскрываецца ў паэмах «У вёсцы», «Вераніка», у цыкле вершаў «Каханне і смерць» і інш. Цыкл «Мадонны» М. Багдановіч прысвяціў Ганне Какуевай.



*Экспазіцыя пятай залы музея*

Атмасфера трагізму апошніх месяцаў жыцця Максіма Багдановіча, нязбытнасць мар і жаданняў, у пятай зале перадаюцца праз сімвалізм экспанатаў і складанае мастацкае вырашэнне. У параўнанні з папярэднімі , у гэтай зале – невялікая колькасць экспанатаў. На металічных канструкцыях залатымі літарамі выпісаны назвы тых зборнікаў, якія М. Багдановіч хацеў выдаць, але не паспеў. Лепка на стоілі і сценах праз ідэю вобраза Страціма-лебедзя раскрывае тэму нязздзейсненых жаданняў, таксама раскрываецца ідэя высокага прызначэння чалавека перад Сусветам. Дамінанта залы – кішэнны гадзіннік, які падарыў Максіму яго бацька і які адлічыў апошнія імгненні жыцця паэта. Зямны гадзіннік спыніўся, нябесны – вечна будзе працягваць свой ход...

### 5. *Дзейнасць музея*

Літаратурны музей Максіма Багдановіча ажыццяўляе актыўную дзейнасць па разнастайных накірунках.

***Навукова-асветніцкая дзейнасць музея:***

– Экскурсіі на беларускай і рускай мовах: аглядавая – «Максім Багдановіч. Жыццё і творчасць» і тэматычныя – «Любоўная лірыка Максіма Багдановіча», «Фальклорныя матывы ў творчасці Максіма Багдановіча», «Пейзажная лірыка Максіма Багдановіча».

– Тэматычныя лекцыі: «Максім Багдановіч. Жыццё і творчасць», «Зачараванае царства», «Пейзажная лірыка Максіма Багдановіча», «Любоўная лірыка Максіма Багдановіча».

– Перасоўная выстаўка, прысвечаная жыццю і творчасці Максіма Багдановіча.

– Кіналекторый.

– Літаратурна-музычныя вечарыны, прэзентацыі, сустрэчы з творчымі асобамі і г.д.

– Свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета» (у філіяле музея «Фальварак Ракуцёўшчына»).

– Мерапрыемствы да Дня памяці Максіма Багдановіча (25 мая), Дня нараджэння Максіма Багдановіча (9 снежня).

– Правядзенне конкурсаў дзіцячай творчасці.

***Навукова-экспазіцыйная дзейнасць:***

– Стварэнне экспазіцый і выставак.

***Навукова -даследчыцкая і фондавая дзейнасць:***

– Арганізацыя ўліку і захавання музейных прадметаў, падрыхтоўка уніфікаваных навуковых пашпартоў, картак інвентарнага апісання.

– Вывучэнне музейных калекцый у мэтах іх актыўнага выкарыстоўвання ва ўсіх відах дзейнасці музея (стварэнне канцэпцый выставак і тэматыка-экспазіцыйных планаў, падрыхтоўка публікацый і г.д.).

– Падрыхтоўка тэкстаў для зборніка навуковых прац і матэрыялаў А. Я. Багдановіча, бацькі паэта.

– Арганізацыя і правядзенне Міжнародных навукова-практычных канферэнцый па пытаннях багдановічазнаўства.

– Пошук новых матэрыялаў аб жыцці і творчасці М. Багдановіча і яго акружэння.

***Выдавецкая дзейнасць:***

– Выданне зборнікаў дакладаў навукова-практычных канферэнцый.

– Выданне сувенірнай прадукцыі.

**Філіял музея «Беларуская хатка»**



***Агульныя звесткі***

Філіял Літаратурнага музея Максіма Багдановіча **«Беларуская хатка»** знаходзіцца ў цэнтры Мінска. Экспазіцыя размясцілася ў доме, які мае вялікую каштоўнасць для гісторыі нацыянальнай культуры. Менавіта ў гэтым доме, з кастрычніка 1916 па люты 1917 г., жыў класік беларускай літаратуры М. Багдановіч. У гэты час паэт напісаў бессмяротны верш-гімн «Пагоня» і ліра-эпічную паэму «Страцім-лебедзь». У 1991 г. у гэтым доме быў адчынены філіял Літаратурнага музея М. Багдановіча.

***Гістарычная даведка***

Філіял быў адчынены 25 чэрвеня 1991 г. у доме, які некалі належаў выкладчыку вучылішча Лібава-Роменскай чыгункі С. І. Рэдзьку. За час свайго існавання з 1904 г. дом паслужыў прытулкам для многіх знакамітых людзей Беларусі, сярод якіх З. Бядуля, Я. Лёсік, З. Верас, М. Багдановіч і інш. У 1984 г. было прынята рашэнне перанесці дом з вул. Талстога (былая вул. Мала-Георгіеўская) на Рабкораўскі завулак.

Назву «Беларуская хатка» філіял атрымаў у гонар аднайменнага клуба інтэлігенцыі, актыўным удзельнікам якога быў паэт.

***Апісанне экспазіцыі***

Экспазіцыя філіяла «Беларуская хатка» – гэта своеасаблівы працяг экспазіцыі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча. Яна прысвечана мінскаму перыяду жыцця класіка, а таксама літаратурна-грамадскаму руху пач. XX стагоддзя ў Мінску.



*Беларуская хатка. Экспазіцыя*

Мастацкая канцэпцыя экспазіцыі належыць Эдуарду Агуновічу. Афармленне інтэр’ера стылізавана пад «мадэрн».

Асноўнай дамінантай экспазіцыйнай залы з’яўляецца сінтэз музея і тэатра, які дасягаецца дзякуючы складанай канструкцыі вітрын і старадаўняму лялечнаму тэатру батлейка (копія Магілёўскай батлейкі XIX ст.). Тэатр нясе падвойную нагрузку: паказ батлейкі – няздейсненая мара М. Багдановіча і яго сяброў, таксама гэта люстэрка культурнага жыцця тагачаснай Беларусі. На складнях-вітрынах гэта адлюстроўваецца праз экспанаванне афіш, фотаздымкаў, зборнікаў п’ес, песень і нот, а таксама газет і аўтографаў, звязаных са зборам матэрыялаў пра батлейку.

Вяртанне М. Багдановіча на Радзіму прадстаўлена праз аўтэнтычныя рэчы, эпісталярную спадчыну, фотаздымкі. Сімвалам дарогі, якая пралягае праз усё жыццё паэта, з’яўляецца сямейная рэліквія – рушнік, карункі да якога рабіла бабуля М. Багдановіча.

Літаратурна-грамадскае жыццё прадстаўлена некалькімі тэмамі. Гэта дзейнасць клуба інтэлігенцыі «Беларуская хатка» і Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, у якія ўваходзілі: Л. Сівіцкая (Зоська Верас), Э. Л. Садоўская-Сівіцкая, А. Смоліч, В. Фальскі, У. Галубок, Ядвігін Ш., В. Лявіцкая, А. Паўловіч, А. Уласаў, Ф. Шантыр, Л. Заяц, І. Буйніцкі. Знаёмства з імі адбываецца праз фотаздымкі, мемарыяльныя рэчы, кнігі, часопісы, дакументы, эпісталярную спадчыну і іншыя цікавыя матэрыялы.

Шырока прадстаўлена дзейнасць Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны: гэта арганізацыя бясплатных і танных сталовых, ткацкіх мастэрняў, бежанскіх і дзіцячых прытулкаў, пра што сведчаць прашэнні, квітанцыі, прадметы таго часу. Сярод іх ёсць і экспанаты, што маюць непасрэднае дачыненне да М. Багдановіча, які працаваў у Губернскім харчовым камітэце і прымаў актыўны ўдзел у дзейнасці Таварыства.

Мемарыяльная частка дома прадстаўлена поўнасцю адноўленым інтэр’ерам пакоя, у якім жыў паэт, і часткова рэканструяванымі пакоямі З. Бядулі і яго сясцёр. Калі М. Багдановіч прыехаў у Мінск, менавіта яны займалі правую частку дома Рэдзькі, і З. Бядуля саступіў Максіму свой пакой – вялікі, светлы, з асобным уваходам. З мэтай паказаць гарадскі побыт таго часу створаны невялікія інтэр’ерныя вузлы – кухня, дзявочы куток, напоўненыя рэчамі, знойдзенымі ў тым раёне горада, дзе знаходзіўся дом.

Мемарыяльны пакой паэта – старонка мінулага. Яго атмасфера (інтэр’ер адноўлены па ўспамінах З. Верас, Л. Зайца, З. Бядулі) пераносіць нас у той час, калі тут жыў Багдановіч. Тут можна ўбачыць бутэлечкі, шклянкі, медыцынскія мензуркі і рэліквіі (асабістыя рэчы М.

Багдановіча) – ступку для здрабнення лекаў  і падшклянак. Працоўную атмасферу перадаюць стосы кніг і папер, яго адзіны зборнік «Вянок», сшытак буквара, рукапіс артыкула «Санет». Сярод творчай лабараторыі паўстае дарагі сэрцу Максіма партрэт маці.

Не зважаючы на хваробу, Багдановіч працаваў па начах, таму ў пакоі прыцемак, які дасягаецца дзякуючы зацемненаму аконнаму шклу. Ствараецца ўражанне нядаўняй прысутнасці паэта. Напэўна, тут у адну з бяссонных начэй нарадзілася паэма «Страцім-лебедзь», якая стала прарочай для хворага Максіма. Была надрукавана ў газеце «Вольная Беларусь» пасля смерці аўтара (1918 г.) і прадстаўлена ў экспазіцыі побач з некралогам, напісаным З. Бядулей.

На жаль, нядоўга пражыў паэт на радзіме. У лютым 1917 г. ён вымушаны быў пакінуць абжыты куток, паехаў на лячэнне ў Ялту. Дом, у якім зараз размяшчаецца філіял музея «Беларуская хатка», стаў апошнім прытулкам М. Багдановіча на радзіме.

Філіял музея «Беларуская хатка», як і аднайменны клуб мінскай інтэлігенцыі пачатку XX ст., адначасова і асяродак беларускай культуры. Тут праходзяць літаратурна-музычныя вечарыны, прысвечаныя юбілейным датам і цікавым падзеям гісторыі і культуры нашай краіны, сустрэчы з пісьменнікамі, артыстамі, музыкантамі, мастакамі, вучонымі.

Філіял музея «Беларуская хатка» прапаноўвае наведвальнікам экскурсіі па музею з праглядам урыўка батлеечнага спектакля; традыцыйны батлеечны спектакль; лекцыю «Музыка ў жыцці і творчасці Максіма Багдановіча».

**Філіял музея «Фальварак Ракуцёўшчына»**



***Агульныя звесткі***

Філіял Літаратурнага музея М. Багдановіча **«Фальварак Ракуцёўшчына»** – музейны комплекс у вёсцы Ракуцёўшчына Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці.

У маёнтку Лычкоўскіх, летам 1911 г., гасцяваў класік беларускай літаратуры М. Багдановіч. У Ракуцёўшчыне паэт напісаў два цыклы вершаў: «Старая Беларусь» і «Места» (усяго 17 вершаў) і дзве паэмы «Вераніка» і «У вёсцы».

«Фальварак Ракуцёўшчына» ўключае ў сябе: сядзібу Лычкоўскіх, тэрыторыю вакол сядзібы, крыніцу Максіма, помнік і пісьменніцкі парк.

***Гістарычная даведка***

Музеефікацыя ракуцёўшчынскіх мясцін пачалася ў 70-я гг. ХХ стагоддзя. У чэрвені 1977 г. па прапанове супрацоўнікаў Мінскага абласнога краязнаўчага музея (г. Маладзечна) быў устаноўлены помнік у вёсцы Ракуцёўшчына – два камяні: адзін як вечная свечка памяці, на другім – выбіты радкі з «Санета» М. Багдановіча. У 1981 г. каля помніка вядомымі беларускімі пісьменнікамі быў пасаджаны «Максімаў сад».

З 1991 г. пачалося аднаўленне сядзібы Лычкоўскіх.

***Апісанне экспазіцыі***

На сённяшні момант у філіяле адноўлены дом гаспадара, дом арандатара, гумно, у двух апошніх пабудовах адчынены экспазіцыі.

У першую чаргу быў адноўлены Дом арандатара, дзе ўлетку 1911 г. жыў М. Багдановіч. У гэтым доме, дзе, як сцвярджаў сам паэт, вельмі добра пісалася, створана музейная экспазіцыя. Цэнтральнае месца займае фотаздымак дзевятнаццацігадовага Максіма Багдановіча, побач − яго адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў «Вянок» (1913 г.), фотаздымкі сяброў Антона і Івана Луцкевічаў, В. Ластоўскага, паштоўкі з выявамі Вільні. Гэтыя экспанаты распавядаюць пра адзін з самых творча насычаных перыядаў жыцця паэта. У інтэр’еры пакоя выкарыстаны прадметы мэблі, побыту пачатку ХХ стагоддзя: драўляны ложак, стол. На ім размешчаны кнігі французскіх аўтараў, якімі захапляўся М. Багдановіч (П. Верлен, Г. Флабэр, Ш. Бадлер). Над сталом лунае птушка з саломкі, як сімвал паэтычнага натхнення.

Кожны з прадметаў паасобку і ўсе яны разам ствараюць уражанне, што малады паэт, які жыве ў гэтым дамку, пакінуў яго хвіліну назад: выйшаў на шпацыр альбо запрошаны да гаспадароў.



*Фальварак Ракуцёўшчына*

У Доме гаспадара ўзноўлены інтэр’еры гасцёўні, кухні, створаны дзіцячы пакой. Самая вялікая частка экспазіцыі размясцілася ў гасцёўні. Рэканструкцыя інтэр’ера гэтага пакоя суправаджалася стварэннем адпаведнай, нават некалькі рамантызаванай атмасферы, на якую звяртала ўвагу ў сваіх успамінах Я. Шабуня. Менавіта тут маладога паэта сустракалі гаспадары з беларускай гасціннасцю і шчырасцю, былі яго суразмоўцамі і дарадцамі.

Для стварэння адпаведнага настрою і адлюстравання тагачаснага жыцця шляхціча выкарыстаны кнігі і газеты, якія падкрэсліваюць адукаванасць гаспадара, яго актыўную жыццёвую пазіцыю, цікаўнасць да гісторыі і літаратуры. Асаблівую ўтульнасць пакою надае вялікі круглы стол, які займае цэнтральнае месца і сервіраваны для гарбаты. Экспануюцца фотаздымкі родных гаспадара, Зоф’і Лычкоўскай, Эміліі Шабуні і яе дачкі Яніны, да якой вельмі цёпла ставіўся М. Багдановіч.

Пяшчотнасць, замілаванне Максіма Багдановіча ў адносінах да дзяцей раскрываецца ў яго шматлікіх вершах. Адметнасцю экспазіцыі ў Доме гаспадара стаў дзіцячы пакой. Лялечная мэбля, буфет і канапка, маленькая дзявочая кашулька з далікатнымі карункамі, палічка з кнігамі. Побач − калыска з лазы, магчыма, у такой калысцы некалі засынала маленькая Яніна пад казкі, якія расказваў ёй Максім.

Кухня ў дамах дробнай шляхты выкарыстоўвалася па сваім прамым прызначэнні − для прыгатавання ежы і захоўвання прадуктаў. Яе інтэр’ер адноўлены часткова, экспануюцца тыповая мэбля і прадметы хатняга ўжытку. Вязанкі часныку і цыбулі, сушаных яблыкаў і зёлак ствараюць адчуванне таго, што тут жывуць сапраўдныя гаспадары, гасцінныя і шчодрыя.

Уявіць сабе жыццё беларусаў, «поўнае штодзённага клопату», можна пры наведванні гумна, якое раней служыла для захавання і сушкі снапоў і іх далейшага абмалоту. У экспазіцыі прадстаўлены прылады працы селяніна − сярпы, цапы, прылады для апрацоўкі ільну і інш. У цэнтры − тагачасныя транспартныя сродкі: сані і воз − узор сталярнай і кавальскай працы. Цікавымі пададуцца наведвальніку вялізныя карабы для захоўвання зерня, пляцёнкі з лазы і саломы, дзежкі.

Супрацоўнікі філіяла «Фальварак Ракуцёўшчына» прапаноўваюць наведвальнікамі экскурсіі па экспазіцыі філіяла, аглядавыя і тэматычныя лекцыі, арганізацыю і правядзенне творчых вечарын, сустрэч з цікавымі людзьмі.

*Матэрыял прадастаўлены Літаратурным музеем М. Багдановіча*

## Музей Максіма Багдановіча ў Гродна



Музей Максіма Багдановіча ў Гродне адкрыты ў 1986 г. (вул. 1-га Мая, 10), як літаратурны аддзел Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, у доме, у якім жыла сям’я Багдановічаў.

З 1 студзеня 1995 г. музей працуе як самастойная ўстанова культуры. Літаратурны аддзел быў размешчаны ў 4-х пакоях дома (плошча экспазіцыі 56 м²). У гэтым доме з 1892 па 1896 гг. жыў беларускі паэт М. Багдановіч (у 1965 г. на доме была ўсталявана мемарыяльная шыльда.) Экспазіцыя літаратурнага аддзела знаёміла з выглядам Гродна канца XIX – пач. XX стст. Тут былі змешчаны сямейныя фотаздымкі і асабістыя рэчы паэта, прыжыццёвы зборнік паэта «Вянок» (1913 г.), а таксама перавыдадзены ў больш позні перыяд. Другі раздзел быў прысвечаны наведванню М. Багдановічам Ракуцёўшчыны. Экспазіцыя знаёміла з дзейнасцю газеты «Наша Ніва» і выдавецкай суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца». Таксама тут быў прадстаўлены мінскі перыяд жыцця і творчасці паэта і апошнія месяцы жыцця ў Ялце. У адным з пакояў быў узноўлены інтэр’ер кабінета – кватэры Багдановічаў.

Пасля надання музею статусу самастойнай адзінкі культуры плошча экспазіцыі пашырылася – на сённяшні дзень яна складае 150 м². У экспазіцыйных залах і фондах 13.697 адзінак захавання, у тым ліку 10.827 – асноўнага фонду (на 25.09.2007 г.). Экспазіцыя мае залы: партрэтная галерэя знакамітых людзей; літаратурна-грамадскі рух канца XIX–пачатку XX ст.; гродзенскі перыяд жыцця сям’і Багдановічаў.

Ёсць чатыры мемарыяльныя пакоі: кабінет бацькі, пакой маці, дзіцячы пакой, гасцёўня, а таксама аддзел «Гродзеншчына літаратурная: мінулае і сучаснае». Сярод экспанатаў музея – асабістыя рэчы паэта, дакументы, пісьмы і іншыя рэчы сям’і Багдановічаў, прадметы побыту канца XIX-га – пачатку XX стст., пісьмовыя сведчанні грамадскага і літаратурнага жыцця таго часу, а таксама літаратурная спадчына паэтаў і празаікаў Гродзеншчыны – М. Васілька, А. Карпюка, В. Быкава, Л. Ялоўчык, Д. Бічэль, Ю. Голуба, А. Пяткевіча і інш.

*Мемориальный дом-музей М. Богдановича г. Ярославль*



Музей располагается в исторической части города, в Центральном районе. Дом 1908 г. – типологическая городская постройка – одноэтажный, деревянный с наличниками в стиле модерн. С 1912 по 1914 гг. в доме жил классик белорусской национальной литературы Максим Богданович и его отец – известный ученый Адам Егорович Богданович. В этом доме поэт подготовил к изданию единственный прижизненный сборник стихов «Вянок», который принес М. Богдановичу славу поэта. Это единственный сохранившийся до наших дней дом, который снимала семья Богдановичей в Ярославле. Ярославль стал для поэта второй Родиной, здесь он прожил 8 лет своей жизни. В 1991 г. в Ярославле был успешно реализован российско-белорусский проект по созданию Музея классика белорусской литературы Максима Адамовича Богдановича в мемориальном доме. Экспозиция была открыта в декабре 1992 г. В ее создании принимали участие белорусские и ярославские музейщики. С 1995 г. музей получил статус Центра Белорусской культуры. При Центре действует региональная общественная организация русско-белорусской дружбы «Сяброўства».

***Экспазіцыя***

Экспозиция мемориального дома-музея М. Богдановича состоит из 3 залов.

**Зал I.** Отражает детские и юношеские периоды жизни белорусского поэта. Частично восстановлены фрагменты комнаты Максима-Книжника с мемориальными настенными часами, книжным шкафом, а также почитаемыми в семье реликвиями – иконой Казанской Божьей матери и гелиогравюрой «Сикстинская мадонна» (подарок Максима Горького).



*Зал, посвящённый детским и юношеским годам жизни М. Богдановича*

**Зал II.** Посвящен владельцам дома – семье Ржевских.

**Зал III.** Посвящен Ярославскому периоду жизни поэта. В холле музея представлен материал об исторических связях Ярославской области и регионов Беларуси.



*Зал, посвящённый Ярославскому периоду жизни М. Богдановича*

http://maksimbogdanovich.ru/museums/5.htm